Тэма сачынення: «Мая Радзіма - Беларусь»

Банькоўскі Яраслаў

ДУА "Сярэдняя школа №12 г.Баранавічы", 6 клас

Я не жыў, усё тужыў.

Дзе б ні быў, дзе б ні лятаў,

Родны край успамінаў.

А.Дзеружынскі

Магчыма, мае думкі і разважанні наконт тэмы сачынення супадуць з іншымі вучнямі краіны, але гэта асабіста мае меркаванні. Прачытаўшы назву, я чамусьці захацеў на кожную літару тэмы падабраць "эпітэт" аб маёй Беларусі. Вось, што атрымалася.

**М**аляўнічая… Адразу ж усплываюць у думках блакітныя люстры азёр і рэк, зялёныя прасторы лясоў, бякрайнія палі і лугі. Шчыра захоўваюць прыродныя багацці і маленькія беларусы, і дарослыя.

**А**дзіная… А немагчыма па-іншаму. На Радзіме жывецца прасцей і дыхаецца лягчэй. Усё знаёмае і роднае воку і думкам.

**Я**касная… Ва ўсім свеце цэняць беларускую прадукцыю, якая пастаўляецца не ў адзін дзясятак краін. Вырабы робяцца з душой, "на сумленне". Многія з іх заваявалі знак "Брэнд года", адзначаны гарантыяй якасці.

**Р**одная… Таму, што тут жывуць родныя майму сэрцу людзі. Тут здзяйсняюцца мае мары і жаданні.

**А**ктыўная…Моладзь краіны складае амаль 20 % ад усяго насельніцтва. Яна актыўна займаецца спортам, вядзе здаровы лад жыцця, прымае ўдзел у валанцёрскім руху. Старэйшае пакаленне не ўступае моладзі, а натхняецца іх працай, здольнасцямі, магчымасцямі.

**Д**арагая…Радзіма – гэта каштоўнасць. Жыць на ёй – гэта каштоўнасць. Чуць і бачыць – гэта каштоўнасць. Я рады, што сёння ў мяне гэта ёсць.

**З**вонкая…Якія б выпрабаванні ні ляглі на плечы краіны, побач заўсёды была песня. Для немаўля – калыханка, для дзяцей – забаўлянка, для птушак – вяснянка, для салдацікаў - "Славянка".

**І**дэальная…На сённяшні момант, магу сказаць, што Беларусь сучасная дасягнула сваёй вышэйшай мэты. Многае зроблена і робіцца для грамадства, прамысловасці. Канешне, ідэал шчасця для кожнага асабісты. Для мяне – гэта спакой і мір, узаемадапамога, бацькі, вучоба, сябры. Мару аб тым, каб не так хутка дарослець.

**М**атчына… Матуля для мяне галоўны чалавек. Яна навучыла хадзіць, размаўляць, любіць і шанаваць. Працуе ў школе настаўніцай малодшых класаў. Як і мяне, яна любіць і дзяцей свайго класа. І іх таксама вучыць любіць, берагчы, падтрымліваць адзін аднаго, працаваць. Я – люстэрка сваёй матулі, яе працяг.

**А**паленая… Хатынь, Ала…Сотні вёсак чакаў лёс Хатыні ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гора і пакуты людзей будуць помніцца назаўжды. Цяжкія выпрабаванні не зламалі беларусаў. Вечна будзем помніць подзвіг народа.

**Б**агатая…У маёй краіне знойдзецца ўсё для пераборлівага чалавека. Гэта і прырода з буйствам фарбаў, і лепшыя санаторыі для аздараўлення, запаведныя месцы і тарговыя цэнтры. Усё зроблена з душой і для душы.

**Е**ўразійская …Сёння Беларусь актыўна выбірае напрамак узаемадзеяння з іншымі краінамі-суседзямі. Як добрасумленнага партнёра, нас выбіраюць Расійская Федэрацыя, Казахстан і Арменія.

**Л**агодная…Народ у нас дабрадушны і ласкавы. Не любім мы канфліктаваць і лезці ў спрэчку. Але ж калі спатрэбіцца, зможам за сябе пастаяць. Чужога нам не трэба, але і свайго не аддадзім.

**А**брадавая…Беларускі народ не толькі ўмее працаваць, але і адпачываць. Кожнае свята мае свой сэнс і традыцыі. Асабіста люблю “Каляды”. Назіраў за святам у бабулі ў вёсцы. У горадзе такога не ўбачыш. Калі б не было “Вялікадня”, хіба змог пагуляць у “біткі” і наесціся “ад пуза” кулічоў. А на “Купалле” шукаць папараць-кветку.

**Р**азумная… У рэйтынгу самага высокага ўзроўню IQ насельніцтва Беларусі займае 7 пазіцыю!

**У**радлівая…Беларус працавіты. Беларусы здаўна прывучаны да працы. Працаваць да стомы ў нас у крыві, мы увабралі з малаком маці. Таму і палі ўрадлівыя, дагледжаныя.

**С**учасная…Беларусь – гэта не толькі нашчадкі крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. Гэта краіна розных нацыянальнасцей. Мірная і добразычлівая да кожнага чалавека.

Шчасця табе, дарагая БЕЛАРУС**Ь**!